

НОВЫ ПАРАДАК РЭГІСТРАЦЫІ НА ЦТ 3

ПАДАРУНКІ ДА ЮБІЛЕЮ ЖЫРОВІЦКАГА МАНАСТЫРА 4



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 МАЯ 2020 г. СУБОТА № 84 (29198)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

*«Першамай — любімае свята многіх беларусаў. Сутнасць гэтага свята працы — у аб'яднанні, салідарнасці працоўных. А сёння той выпадак, калі сваю салідарнасць трэба праяўляць ў аб'яднанні намаганняў у барацьбе з распаўсюджваннем COVID-19. Федэрацыя прафсаюзаў у гэтых адносінах сфакусіравала свае магчымасці на некалькіх кірунках. Прафкамы накіроўваюць грошы на закупку ахоўных сродкаў для работнікаў прадпрыемстваў. У арганізацыях створаны касы ўзаемадапамогі. Пад асаблівай увагай і клопатам прафсаюзаў — работнікі тых галін, якія ў сілу прафесійных абавязкаў кантактуюць з вялікай колькасцю людзей і маюць павышаную рызыку захворвання. Асобным пытаннем у прафсаюзаў стаяць страхаванне і матэрыяльная падтрымка медыкаў».*

# УСЕ КВЕТКІ МАЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- **Чэмпіянат свету па хакеі ў 2021 годзе пройдзе ў Беларусі і Латвіі.**
- Месячныя ліміты на пасылкі з-за мяжы адмяняюцца ў Беларусі з 1 мая.
- **Белстат: самая мужчынская прафесія — будаўнік, а жанчыны пераважаюць у сацсферы.**
- Краіны АПЕК+ пачалі самае маштабнае ў гісторыі скарачэнне здабычы нафты з-за пандэміі.
- **Суд Кармянскага раёна прыгаварыў паляўнічага да двух гадоў пазбаўлення волі за незаконную здабычу высакароднага аленя.**

На слыху

## «Выратавала тое, што бацьку своечасова шпіталізавалі»

### Мінчанка расказала, як яе сям'я лечыцца ад каранавіруса

**27-гадовая Вераніка трапіла ў лік тых, хто лечыцца ад каранавіруснай інфекцыі дома. Спачатку яна была на бальнічным з тэмпературай. Пасля таго, як у бальніцу з двухбаковай пнеўманіяй трапіў яе бацька, у дзяўчыны ўзялі тэст на COVID-19, ён аказаўся станоўчы. Яна расказала «Звяздзе», як спраўляецца з інфекцыяй, чаму тэрапеўт з паліклінікі запомніла ўсю іх сям'ю і як урачы нават без тэстаў вызначаюць «кавідных» пацыентаў.**

Вераніка са сваім маладым чалавекам жыве ў кватэры разам з бацькамі.

— Першы у сям'і захварэў мой тата. Некалькі дзён трымалася высокая тэмпература, ніякіх іншых сімптомаў. Выклікалі ўрача, адправілі на бальнічны. У аўторак тэмпература ў яго паднялася да 39,7 градуса. Мама патэлефанавала ў хуткую дапамогу. Там спыталі, ці быў хтосьці з нас за мяжой. Мама адказала, што не. Фельчар параіла дадаць да прызначанага ўрачом лячэння но-шпу, і брыгада не прыязджала. Тата дачакаўся пятніцы, калі быў прызначаны прыём ва ўрача, і пайшоў у паліклініку. Там зрабілі здымак — двухбаковая пнеўманія. Урач дала накіраванне ў бальніцу і папрасіла дабірацца туды самастойна. Праўда, дома мама зноў выклікала «хуткую», і добра, што так зрабіла: накіраванне далі ў 10-ю бальніцу, але яна на той час была цалкам аддадзена для хворых на каранавірус, з непацверджаным дыягназам туды не прымалі. «Хуткая» звязвалася з дыспетчарам і ў выніку адвезла тату ў РНПЦ пульманалогіі.

СТАР. 3

Педсавет

## ТЭСТ НА ПРАФЕСІЙНУЮ ПРЫДАТНАСЦЬ

### Ці гатовыя настаўнікі працаваць у новых умовах?

**Адзіная платформа для дыстанцыйнага навучання школьнікаў можа з'явіцца да канца года. Пра гэта ў інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь 1» паведаміў міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА. Між іншым, з праблемай, як вучыць дзяцей, якія не вярнуліся пасля працяглых канікул у школьныя класы, а тым больш як іх атэстоўваць, настаўнікі сутыкнуліся ўжо цяпер. Пандэмія каранавіруса зладзіла сапраўдны стрэс-тэст для беларускай сістэмы адукацыі. І першы тыдзень вучобы паказаў, што з-за адсутнасці дакладнага алгарытму дзеянняў, які так і не з'явіўся на ўзроўні кіравання, кожная ўстанова адукацыі шукае свае шляхі выхаду з сітуацыі. Мы пагутарылі з педагогамі дзвюх навучальных устаноў, якія з'яўляюцца партнёрамі праграмы «Настаўнік для Беларусі», каб даведацца, што ім удалося зрабіць, каб не пакінуць дзяцей за бортам навучальнага працэсу.**

СТАР. 5



**Ала ГАЛУБКОВІЧ: «Лічу, што настаўнік павінен асвойваць розныя формы камунікацыі з вучнямі і трансляцыі ім вучэбнага матэрыялу».**

ISSN 1990 - 763X